# РОЛЯ ЛІТАРАТУРНАГА МУЗЕЯ Ў ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ (з вопыту работы Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры)

**І. Г. Лупашка,** *навуковы супрацоўнік Цэнтра міжнароднага супрацоўніцтва і адукацыйных праграм Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2012 г. Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры (далей – ДМГБЛ) святкуе сваё 25-годдзе: ён быў заснаваны ў лістападзе 1987 г., а адкрыты для наведвальнікаў у 1991 г. ДМГБЛ з'яўляецца музеем рэспубліканскага падпарадкавання і мае тры філіялы (Літаратурны музей Кузьмы Чорнага, Музей-сядзіба Міцкевічаў «Завоссе», Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча «Кушляны»). Гэта адзіны ў краіне музей, мэтай якога з'яўляецца дакументаванне нацыянальнага агульналітаратурнага працэсу. За перыяд свайго існавання супрацоўнікамі ДМГБЛ праведзена грунтоўная работа па зборы, вывучэнні, захаванні і прэзентацыі літаратурнай спадчыны як часткі гісторыка-культурнай.

Музей у сучасным грамадстве – гэта не толькі навукова-асветная ўстанова, але і цэнтр культуры, які вырашае ў тым ліку і задачы развіцця і выхавання асобы. Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 16 ад 24.05.2011 г. зацверджана Праграма бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі на 2011–2015 гг. У якасці аднаго з асноўных кірункаў выхавання дзяцей і моладзі дадзенай праграмай вызначаецца грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, прававой і інфармацыйнай культуры [3]. Прыярытэтная роля ў гэтым працэсе адводзіцца ўстановам адукацыі, якія, безумоўна, з'яўляюцца найважнейшымі інстытутамі сацыялізацыі асобы. Тым не менш нельга недаацэньваць значэнне і магчымасці музеяў у патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі. Засноўваючыся на вопыце дзейнасці ДМГБЛ, паспрабуем вызначыць ролю і магчымасці літаратурнага музея ў патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі.

Агульнапрынятае трактаванне паняцця «патрыятызм» – любоў да радзімы. Калі паспрабаваць дэталізаваць яго, то, на наш погляд,

патрыятызм складаецца з гонару за сваю радзіму, яе сацыяльныя і культурныя дасягненні, праяўлення грамадзянскіх пачуццяў і захавання вернасці айчыне, з пачуцця прыхільнасці і любові да сваёй малой радзімы, паважных адносін да мінулага свайго народа, яго мовы, літаратуры, звычаяў, традыцый і інш.

Музей мае значныя магчымасці для вырашэння задач патрыятычнага выхавання: у ім за невялікі прамежак часу, які доўжыцца экскурсія, лекцыя ці іншае мерапрыемства, наведвальнік можа паглыбіцца ў мінулае, супаставіць яго з сённяшнім днём, пазнаёміцца з рознымі культурамі і параўнаць іх са сваёй. Спецыфіка выхаваўчага патэнцыялу музея заключаецца ў выкарыстанні непасрэдных гістарычных сведкаў, помнікаў, якія адлюстроўваюць гісторыю народа, у тым ліку яго патрыятычныя традыцыі. Музейныя экспанаты маюць унікальныя ўласцівасці ўздзейнічаць адначасова як на інтэлектуальную, так і на эмацыянальную сферу асобы.

Як адзначалася вышэй, любоў і павага да роднай мовы і літаратуры – адно з праяўленняў патрыятызму. Акрамя таго, менавіта мастацкая літаратура ўтрымлівае найвялікшы выхаваўчы патэнцыял. У ДМГБЛ праводзіцца вялікая праца па ўшанаванні і папулярызацыі творчай спадчыны дзеячаў беларускай літаратуры. Стварэнне персанальных выстаў – адзін з кірункаў гэтай дзейнасці. На сёння пераважная большасць такіх выстаў арганізуецца з нагоды юбілейных дат. Сярод персанальных юбілейных выстаў, створаных за апошняе дзесяцігоддзе, хацелася б адзначыць наступныя: «Алесь Адамовіч. А для вечнасці – Беларусь…» (да 75-годдзя пісьменніка, 2002), «Вандроўнік вакол свету» (да 120-годдзя Янкі Маўра, 2003), «Трывожнае шчасце пісьменніка» (да 85-годдзя з дня нараджэння Івана Шамякіна, 2006), «Брама неўміручасці» (да 110-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы, 2006), «Янка Брыль. Сцежкі. Дарогі. Прастор…» (да 90-годдзя з дня нараджэння, 2007), «Свет шчодры. Свет мяне паўторыць…» (да 80-годдзя з дня нараджэння У. Караткевіча, 2010) [1].

Некалькі гадоў таму ДМГБЛ распачаў культурны праект «Дыяменты прыгожага пісьменства». У яго межах арганізуюцца выставы, творчыя вечарыны і прэзентацыі, прысвечаныя 100-гадовым юбілеям пісьменнікаў. Ужо адбыліся такія выставы, як «Зямля мая – мой лёс» (прысвечана пісьменніку і вучонаму Міколе Лобану), «Сэрца майстра ўсім адкрыта...» (прысвечана паэту, перакладчыку, крытыку Аляксею Зарыцкаму), «“Песня Дзвіны”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тараса Хадкевіча», «Паэт з Нарачанскага краю» (прысвечана Максіму Танку).

Традыцыйнымі для беларускіх літаратурных музеяў сталі прэзентацыі. Зразумела, што адной з асноўных задач прэзентацыі з'яўляецца прадстаўленне чагосьці новага. У літаратурным музеі, відавочна, пераважаюць прэзентацыі новых кніг, аднак таксама праводзяцца прэзентацыі кінафільмаў, мультымедыйных выданняў. На гэтых мерапрыемствах адбываецца прадстаўленне твораў як ужо вядомых, так і маладых аўтараў. Для аўтараў асноўным плюсам такіх мерапрыемстваў з'яўляецца непасрэдны кантакт з аўдыторыяй – сваімі рэальнымі і патэнцыяльнымі чытачамі, а наведвальнікі атрымліваюць магчымасць сачыць за падзеямі ў літаратурным жыцці, пазнаёміцца з літаратурным асяроддзем. Толькі ў 2012 г. у ДМГБЛ было праведзена больш за 10 прэзентацый, сярод якіх прэзентацыя збору твораў Максіма Танка ў 13 тамах і кнігі «Максім Танк. На камні, жалезе і золаце» (з серыі «ЖЗЛБ»), прэзентацыя кнігі Тэрэзы Голуб «Летапіс жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова», прэзентацыя першай часткі мультымедыйнай экраннай анталогіі «Хроніка культурнага жыцця Беларусі: творчыя партрэты дзеячаў культуры і мастацтва», створанай у межах Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі (на 2011–2015 гг.)», прэзентацыя «Кнігі для спадарыні Эл» Леаніда Дранько-Майсюка і інш. [2].

Не страцілі актуальнасці і такія формы, як літаратурныя і музычныя вечарыны, творчыя сустрэчы, якія дазваляюць у нефармальнай абстаноўцы наладзіць зносіны з цікавымі людзьмі – пісьменнікамі, музыкантамі, мастакамі, навукоўцамі, задаць ім пытанні, узяць аўтограф і, як вынік, – атрымаць станоўчыя эмоцыі і новыя веды. Традыцыйна праводзяцца ў музеі юбілейныя вечарыны, прымеркаваныя да пэўнай даты ці падзеі. Аднак з'яўляюцца і іншыя цікавыя формы. Літаратурнае краязнаўства, якое валодае найвялікшымі магчымасцямі ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці дзяцей і моладзі, пакладзена ў аснову сацыяльна-культурных праектаў «Рэгіёны» і «Літаратурныя падарожжы».

Праект «Рэгіёны», які накіраваны на папулярызацыю літаратурна-мастацкай спадчыны рэгіёнаў Беларусі, распачаў сваю дзейнасць у 2011 г. з творчай сустрэчы з вядомымі ўраджэнцамі Случчыны: пісьменнікамі, даследчыкамі, літаратуразнаўцамі. У рамках акцыі таксама адбыліся выставы «Вандроўка: зіма – лета»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастака Алены Хатэнка і «Лялечны карагод» Квасыніцкага цэнтра рамёстваў, выступленні фальклорных калектываў. У далейшым да праекта далучыліся і іншыя рэгіёны Беларусі.

На знаёмства з родным краем, цікавымі выбітнымі людзьмі Беларусі скіраваны праект «Літаратурныя падарожжы». Праект распачаўся ў 2012 г. сустрэчай з Іванам і Валянцінай Ждановічамі, якія здзейснілі першую «беларускую кругасветку» – за 120 дзён пешшу прайшлі 2800 кіламетраў уздоўж дзяржаўнай мяжы Беларусі [2].

Выхаванне любові да роднага краю, сваёй «малой радзімы», вывучэнне гісторыі і культуры рэгіёнаў Беларусі, папулярызацыя дзейнасці мясцовых творцаў – такія задачы вырашаюць вышэйузгаданыя праекты.

Асаблівая роля ў патрыятычным выхаванні належыць ваеннай гісторыі. Вялікая Айчынная вайна – тая падзея ў гісторыі нашага народа, якая нікога не пакідае абыякавым. Да юбілеяў вызвалення Беларусі і Перамогі Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры падрыхтаваны два вялікія сацыяльна-культурныя праекты, у межах якіх створаны выставы, праведзены творчыя сустрэчы, прэзентацыі і іншыя мерапрыемствы, прысвечаныя творам аб вайне, аўтарам–удзельнікам вайны.

Праект «Вялікая Айчынная вайна. Да 60-годдзя вызвалення Беларусі і Перамогі» рэалізаваны ў 2004–2005 гг. У 2005 г. музей прадставіў выставу «Доўгія вёрсты вайны», прысвечаную пісьменнікам ваеннага пакалення і літаратуры пра Вялікую Айчынную вайну. На ёй дэманстраваліся ўнікальныя матэрыялы з персанальных архіваў А. Куляшова, В. Быкава, А. Адамовіча, І. Шамякіна, І. Чыгрынава і інш. У межах гэтага праекта адбыўся шэраг творчых сустрэч і прэзентацый: творчая сустрэча з паэтам, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны Міколам Аўрамчыкам, творчая сустрэча з пісьменніцай Аленай Кобец-Філімонавай і прэзентацыя яе кнігі «Распятая Хатынь», прэзентацыя зборніка вершаў пісьменнікаў-франтавікоў «Іскры вечнага агню» і інш.

Сацыяльна-культурны праект «Чалавек нараджаецца, каб жыць…» да 65-годдзя вызвалення Беларусі і Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне падрыхтаваны ДМГБЛ сумесна з Міністэрствам культуры РБ, Беларускім фондам міру, Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Адметнай падзеяй гэтага праекта стала стварэнне літаратурна-дакументальнай выставы «Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам», якая працягвае дзейнічаць у музеі і сёння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выстава складаецца з трох тэматычных блокаў. У першым, які называецца «Жыццёвыя і творчыя вытокі», прадстаўлены матэрыялы пра дзіцячыя і юнацкія гады пісьменніка, выявы роднай хаты, блізкіх і сяброў, сустрэчы з землякамі на Ушаччыне ў пазнейшыя гады. Цэнтральнае месца ў экспазіцыі займае тэматычны блок «Праўда перажытага», які распавядае пра В. Быкава як франтавіка і яго літаратурную творчасць, звязаную з тэмай Вялікай Айчыннай вайны. На выставе прадстаўлены фотаздымкі з аўтографамі 1944–1945 гг. з архіва пісьменніка, яго лісты да родных 1944 г., дэманструюцца кнігі і машынапісы мастацкіх твораў, аўтарскія пераклады з праўкамі, ліставанне В. Быкава з беларускімі і замежнымі пісьменнікамі, выдаўцамі. Закранаецца гісторыя напісання і выдання аповесці «Мёртвым не баліць», «Сотнікаў» і інш. Прадстаўлены фотаздымкі і матэрыялы перапіскі, якія асвятляюць аспекты знаёмства і творчага сяброўства Васіля Быкава з А. Твардоўскім, А. Салжаніцыным, Ч. Айтматавым, Р. Барадуліным, У. Караткевічам і інш. Заключны тэматычны блок – «Асэнсаванне» – прадстаўляе творчую лабараторыю пісьменніка, ліставанне В. Быкава з перакладчыкамі, аўтарскія літаратурныя сцэнарыі, перапіску, звязаную з пастаноўкай фільмаў, праграмы, фотаздымкі да спектакляў. У межах таго ж праекта адкрыта выстава «Дарогамі жыцця» (да 85-годдзя ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны, празаіка Алеся Савіцкага) [2].

Задачы далучэння да музея (а тым самым, апасродкавана, і да роднай мовы і літаратуры) дашкольнікаў і малодшых школьнікаў вырашаюць новыя формы і метады работы, якія выкарыстоўваюцца ў ДМГБЛ. Дыферэнцаваны падыход да музейнай аўдыторыі праяўляецца ў стварэнні адрасных праектаў. За непрацяглы час музеем створаны шэраг тэматычных выстаў, разлічаных пераважна на дзіцячую аўдыторыю: «Кірмаш у Траецкім» (2002), «Ад А да Я – з гісторыі буквара» (2003), «Планета Вясёлка» (2007), «Спадарожнікі дзяцінства» (2008), «Ходзіць Сон ля вакон… » (2012). На гэтых выставах былі абсталяваны спецыяльныя інтэрактыўныя пляцоўкі, што дазваляе выкарыстоўваць сучасныя формы работы, якія адпавядаюць запатрабаванням і псіхалагічным асаблівасцям дзіцячай аўдыторыі. Напрыклад, на выставе «Кірмаш у Траецкім» наведвальнікі маглі ўбачыць батлейку, на выставе «Ад А да Я – з гісторыі буквара» – паспрабаваць пісаць на пясчанай дошцы з «лясной» школы ваеннага часу і складваць словы на спецыяльнай «разразной азбуцы», на выставе «Ходзіць Сон ля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вакон… » – паглядзець адзін з трох выпускаў тэлевізійнай калыханкі розных гадоў.

Прааналізаваўшы дзейнасць ДМГБЛ, зазначым, што з дапамогай экспазіцый і выстаў, разнастайных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці літаратурныя музеі праводзяць featureрознабаковую работу па патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі.


1. *Дакументы* па стварэнні экспазіцый і выстаў (2003–2010) // Матэрыялы ДМГБЛ.

2. *Дзяржаўны* музей гісторыі беларускай літаратуры [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http ://bellitmuseum.by. – Дата доступу : 21.11.2012.

3. *Об утверждении* Программы непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь на 2011–2015 годы : постановление Мин-ва образования Республики Беларусь, 24 мая 2011 г., № 16 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 99. – 8/24085.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ